# МАНІТОРЫНГ РАЗВІЦЦЯ СІТУАЦЫІ У БЕЛАРУСІ
# САКАВІК – КАСТРЫЧНІК 2009

## КАРОТКІ АГЛЯД

У гэтай справаздачы разглядаюцца асноўныя зрухі, якія адбыліся ў сферы грамадзянскай супольнасці ў Беларусі за перыяд з сакавіка па кастрычнік 2009 г. Гэта чацвёртая справаздача дадзенай серыі, мэтай якой з'яўляецца інфармаванне тых, хто прымае рашэнні па сітуацыі ў Беларусі падчас дыялогу з ЕС. Справаздача падрыхтавана супольнымі намаганнямі больш чым 50 беларускіх і міжнародных грамадскіх арганізацый.

З моманту публікацыі нашай апошняй справаздачы[1] ў сакавіку 2009 г. ва ўрадавай палітыцы Беларусі значных зменаў не адбылося. Нягледзячы на тое, што былі зроблены некаторыя саступкі на карысць палітычнай апазіцыі і грамадзянскай супольнасці, што дазволіла ім весці дзейнасць ў пэўных галінах без праследу, рэпрэсіўныя механізмы засталіся і працягваюць выбарачна выкарыстоўвацца. Таксама не адбылося зменаў і ў заканадаўстве, якія б прадэманстравалі сур'ёзныя намеры ў сферы рэфармавання ўрадавай аўтарытарнай палітыкі. Паколькі ў 2010 і 2011 г. адбудуцца мясцовыя і прэзідэнцкія выбары, грунтоўныя змены ў заканадаўстве, якое існуе, і празрыстае выкананне прававых норм з'яўляюцца неабходнымі ўмовамі для правядзення свабодных і справядлівых выбараў, якія прадэманструюць сапраўдны прагрэс у Беларусі.

У перыяд падрыхтоўкі справаздачы былі заўважаны некаторыя станоўчыя тэндэнцыі, у тым ліку:

- Некалькі агульнарэспубліканскіх сустрэч незалежных арганізацый і палітычных партый былі дазволены і праведзены без перашкодаў;
- Рэпрэсіўныя палажэнні новага закону аб СМІ не прымяняліся на практыцы;
- Перарэгістрацыя СМІ праводзілася пераважна ў спрыяльных для іх варунках;
- Былі зарэгістраваны некалькі незалежных арганізацый і газет;
- Было зафіксавана менш адміністратыўных арыштаў і не было заўважана палітычна матываваных выключэнняў з навучальных установаў;

На жаль, назіраўся таксама шэраг негатыўных тэндэнцый, сярод іх:

- Урад па-ранейшаму безпадстаўна адмаўляе ў дзяржаўнай рэгістрацыі незалежным грамадскім арганізацыям, прафсаюзам і палітычным партыям;
- Урад працягвае свае спробы ўсталяваць кантроль і манапалізаваць інфармацыйную прастору ў Беларусі;
- Паводле артыкула 193.1 Крымінальнага кодэксу, за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі быў асуджаны грамадскі актывіст;
- Два моладзевыя актывісты былі прымусова прызваны ў армію;
- У Парламенце адбылося абмеркаванне заканадаўчых нормаў, якія пашыраць магчымасці для адмовы ў рэгістрацыі грамадскім арганізацыям;
- Павялічыўся ціск з боку ўрада на незалежныя прафсаюзы і назіраўся адыход ад правядзення рэформ, паабяцаных раней у гэтым жа годзе;
- Працягваліся рэпрэсіі супраць вернікаў на падставе іх рэлігійных перакананняў і цэркваў;

Насуперак палажэнням неафіцыйнай заявы, выдадзенай беларусім урадам у верасні 2009 г., дадзеная справаздача дэманструе, што ўлады не дасягнулі значнага прагрэсу на шляху да выканання чаканняў ЕС аб правядзенні грунтоўных рэформ і не прыклалі сур'ёзных намаганняў для прывядзення беларускага заканадаўства ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі. Самае галоўнае, урад не пераглядзіў і не

[1] For an appendix of organizations cooperating on this monitoring project and copies of reports on the periods October 2008 – January 2009, January – March 2009 and March – September 2009, please contact biim@eedc.org.pl

адмяніў тыя заканадаўчыя нормы, якія абмяжоўваюць асноўныя свабоды ў Беларусі. Грамадзянская супольнасць расцэньвае т.зв. "лібералізацыю" як рытарычную і касметычную, а не як сапраўднае рэфармаванне сістэмы, якая існуе.

**КРЫТЭРЫІ**

У святле зменаў, а дакладней іх адсутнасці, у справаздачны перыяд, відавочна, што беларускі ўрад вельмі мала зрабіў для паляпшэння становішча грамадзянскай супольнасці. Да сённяшняга дня дыялог паміж дзяржавай і грамадзянскай супольнасцю не прывёў да канрэтных зменаў. Беларускі ўрад падкрэслівае значэнне кансультацый, сустрэчаў і дарадчых органаў, аднак гэта не кампенсуе адсутнасці паслядоўных рэформ.

Грамадзянская супольнасць чакае, што да таго, як ЕС зробіць захады па паляпшэнні стасункаў з Рэспублікай Беларусь, беларускі ўрад павінен прадэманстраваць сапраўдны прагрэс у пяці прыярытэтных накірунках, вызначаных Брусэлем: выбарчае заканадаўства, свабода СМІ, свабода сходаў, свабода аб'яднанняў і сітуацыя з грамадзянскай супольнасцю. У сваю чаргу, грамадзянская супольнасць вызначыла канкрэтныя крытэрыі, якія дапамогуць ацаніць прагрэс у перыяд дыялогу. Беларуская грамадзянскай супольнасць перакананая, што паляпшэнне адносінаў паміж ЕС і Рэспублікай Беларусь[2] магчыма толькі пры ўмове правядзення ўрадам грунтоўных рэформ і выкананні дадзеных крытэрыяў.

Адносна незалежных СМІ:

- Спыненне ўсіх форм ўрадавага ўціску на незалежныя выданні і журналістаў;
- Прывядзенне беларускага заканадаўства ў галіне СМІ у адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі;
- Вяртанне ўсіх незалежных газет у дзяржаўную сістэму друка, падпіскі і распаўсюджвання;
- Акрэдытацыя журналістаў замежных СМІ і дазвол на адкрыццё іх прадстаўніцтваў у Беларусі;
- Адмена артыкулаў аб паклёпе, дыскрэдытацыі, экстрэмізме і іншых артыкулаў Крымінальнага кодэкса, якія выкарыстоўваюцца для запужвання і пераследу незалежных СМІ і журналістаў;
- Адмена адпаведных артыкулаў Закону "Аб дзяржаўнай службе" і прэзідэнцкага дэкрэту №65, якія абмяжоўваюць доступ да інфармацыі.

Адносна свабоды сходаў:

- Прыняцце зменаў у Выбарчы кодэкс, каб прывесці яго ў адпаведнасць са стандартамі АБСЕ;
- Спыненне выкарыстанне сілы супраць мірных дэманстрацый;
- Прывядзенне Закону "Аб масавых мерапрыемствах" у адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі;
- Абвяшчэнне амністыі, памілвання і ўмоўна-датэрміновага вызвалення для ўсіх, хто быў асуджаны па "Справе 14-ці";
- Дазвол на правядзенне незалежнага і адкрытага расследвання справы зняволеных прадпрымальнікаў і актывістаў сп. Аўтуховіча і Асіпенка.
- Спыненне крымінальнага пераследу грамадскіх актывістаў па эканамічных матывах;
- Прывядзенне Закону "Аб рэлігіі" у адпаведнасць з міжнароднымі стандартаамі і спыненне рэпрэсій супраць вернікаў і рэлігійных дэнамінацый.

Адносна свабоды аб'яднанняў:

- Рэгістрацыя ўсіх палітычных партый, НДА, прафсаюзаў і СМІ, якія жадаюць удзельнічаць у беларускай грамадзянскай супольнасці;
- Адмена Артыкулу 193.1 Крымінальнага кодэксу, які крыміналізуе дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый;

[2] "Еўрапейскі парламент настойвае на тым, каб Мінск імкнуўся да прагрэсу ў галіне дэмакратыі" БелаПАН, 2 красавікаl 2009

- Прыпыненне паправак да Закону "Аб НДА", якія разглядаюцца ў Парламенце і, у выпадку прыняцця, абмяжуюць свабоду аб'яднанняў;
- Спрашчэнне працэдуры рэгістрацыі незалежных грамадскіх арганізацый.

Адносна паляпшэння становішча грамадзянскай супольнасці:

- Працяг мараторыя на палітычных зняволеных;
- Спыненне крымінальнага і адміністратыўнага пераследу грамадскіх актывістаў;
- Спыненне усіх палітычна матываваных выключэнняў і звальненняў актывістаў з месцаў іх вучобы і працы;
- Адмена прымусовага прызыву ў армію дэмакратычных актывістаў і стварэнне сістэмы альтэрнатыўнай вайсковай службы;
- Тэрміновае абвяшчэнне мараторыя на смяротнае пакаранне.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ

У сакавіку 2009 г. міністры замежных спраў ЕС прынялі рашэнне не аднаўляць візавыя санкцыі і пагадзіліся працягнуць іх адтэрміноўку на 9 месяцаў дзеля таго, каб заахвоціць беларускі ўрад да ўмацавання сувязяў з ЕС і правядзення "далейшых канкрэтных захадаў па дэмакратызацыі і павазе да правоў чалавека і фундаментальных свабод". Тым не менш, многія прадстаўнікі ЕС неаднаразова падкрэслівалі, што ніякіх значных рэформаў не паследвала. У кастрычніку 2009 г., напрыклад, Рэйнхальд Брэндэр - Намеснік кіраўніка аддзела Еўракамісіі па супрацоўніцтве з Беларуссю, Украінай, Малдовай і краінамі Закаўказзя – адзначыў, што недастатковая дэмакратызацыя і недахоп станоўчых крокаў перашкаджаюць далейшаму збліжэнню Беларусі і ЕС[3].

Еўрапейскі Саюз і беларуская грамадзянская супольнасць заклікаюць да сапраўдных пераменаў. У красавіку Еўрапейскі Парламент заклікаў беларускі ўрад дасягнуць "грунтоўнага прагрэсу" у правядзенні дэмакратычных рэформаў. Рэзалюцыя Еўрапейскага парламенту звяртае ўвагу на неабходнасць стварэння роўных умоваў для ўсіх СМІ і пашырэння свабоды сходаў, аб'яднанняў і рэлігіі. Беларуская грамадзянская супольнасць падзяляе занепакоенасць ЕС - і дадзеная справаздача таксама пацвярджае гэта – недахопам станоўчых сігналаў і захадаў. Прэзідэнт Лукашэнка заявіў: "Некаторыя спекулююць на тым, што напярэдадні сустрэчы Рады ЕС... мы паспрабуем лібералізаваць нешта, каб задаволіць Еўропу"[4]. Гэта тое, супраць чаго я засцерагаю наш урад і міністэрства замежных справаў. Мы не павінны нічога рабіць з гэтай нагоды". У лістападзе ЕС зноў будзе абмяркоўваць лёс далейшых узаемаадносін з Беларуссю і пытанне санкцый. Беларуская грамадзянская супольнасць прапануе наступныя пяць рэкамендацый з мэтай садзейнічаць больш грунтоўным і паслядоўным зменам:

**1. Ніякія захады па адмене візавых санкцый у дачыненні да чыноўнікаў беларускага ўраду не могуць быць прыняты, пакуль не будзе зроблены грунтоўны прагрэс па выкананні акрэсленых вышэй крытэрыяў.**

**2. Прыпыненне санкцый павінна быць працягнута на 18-месячны перыяд. Гэта будзе садзейнічаць кансалідацыі ўжо зробленых беларускім урадам сімвалічных зменаў і дазволіць пераканацца, што не адбудзецца вяртання да неспрыяльнай сітуацыі з правамі чалавека і грамадзянскай супольнасцю, якая назіралася да кастрычніка 2008 г. Вельмі важна, што наступны перыяд прыпынення санкцый ахопіць час мясцовых выбараў 2010 г. і прэзідэнцкіх выбараў 2011 г. у Беларусі.**

**3. У межах Усходняга Партнёрства, ЕС павінны падрыхтаваць усебаковую справаздачу развіцця сітуацыі ў Беларусі за перыяд дыялогу. Агляд сітуацыі і справаздача павінны**

[3] Па афіцыйнай інфармацыі Еўрапейскай камісіі: "Адсутнасць пазітыўных зрухаў у Беларусі з'яуляецца перашкодай для далейшага ўмацавання добрасуседскіх адносін з ЕС" БелаПАН, 2 кастрычніка 2009.
[4] "А. Лукашэнка засцерагае ЕС супраць уціску на Мінск"БелаПАН, 21 кастрычніка 2009

**абапіраццa на канкрэтныя крытэрыі, акрэсленыя вышэй, а таксама даць магчымасць грамадзянскай супольнасці зрабіць свой унёсак.**

**4. Беларуская грамадзянская супольнасць мусіць мець магчымасць садзейнічаць, каментаваць і рабіць свой унёсак у дыялог паміж ЕС і Беларуссю на ўсіх яго этапах.**

**5. Еўрапейскі Саюз, дзяржавы-сябры ЕС і АБСЕ павінны павялічыць сваю прысутнасць у Беларусі дзеля таго, каб здзяйсняць маніторынг развіцця сітуацыі ў Беларусі. У той жа час адпаведная дапамога, скіраваная на адаптацыю і правядзенне рэформаў беларускім уладам, павінна быць павялічана.**

**Ніжэй змешчаны больш падрабязны маніторынг сітуацыі ў Беларусі за перыяд з сакавіка па кастрычнік 2009 г.**

## СВАБОДА СМІ

Нягледзячы на некаторыя сімвалічныя і ізаляваныя крокі з боку ўладаў, асноўныя абмежаванні свабоды слова не зніклі. У сваёй нядаўняй “неафіцыйнай заяве”, беларускі ўрад адзначае грунтоўны прагрэс у дадзенай сферы. Аднак больш уважлівы аналіз паказвае, што пэўныя сцвярджэнні з’яўляюцца, як мінімум, перабольшваннем і не звязаны з сістэмнымі зменамі, якія б дэманстравалі незваротны прагрэс.

У перыяд, які асвятляецца ў справаздачы, было праведзена некалькі міжнародных сустрэч, прысвечаных свабодзе СМІ[5]. Сярод пазітыўных зрухаў трэба адзначыць, што да ўдзелу ў гэтых мерапрыемствах запрашаліся прадстаўнікі як дзяржаўных, так і недзяржаўных СМІ. Адбыліся дзве сустрэчы Каардынацыйнай Рады па СМІ, створанай пры Міністэрстве інфармацыі, у склад якой уваходзяць некалькі прадстаўнікоў незалежных СМІ. Грамадзянская супольнасць вітала магчымасць зрабіць свой унёсак у працу Рады, аднак гэта структура мае выключна дарадчую ролю і яе дзейнасць на дадзены момант не дала ніякіх канкрэтных вынікаў.

У верасні Беларусь наведала міжнародная дэлегацыя ў складзе арганізацый, якія апякуюцца свабодай СМІ. Група прывітала апошнія змены і зазначыла, што ціск на СМІ і журналістаў зменшыўся, але заявіла “што гэтыя змены павінны стаць трывалымі, каб забяспечыць правы журналістаў і распачаць даўно наспеўшыя рэформы сферы медыя. Змены павінны быць доўгатэрміновымі і незваротнымі”[6].

### Новы Закон “Аб СМІ”

У цэлым, практыка прымянення Закону аб СМІ, які моцна крытыкаваўся ЕС і міжнароднымі арганізацыямі, была станоўчай. Перарэгістрацыя СМІ праходзіла спакойна, і газеты не павінны былі выдаткоўваць на яе дадатковыя сродкі. Аднак абавязковая рэгістрацыя СМІ дзяржаўнымі органамі сама па сабе супярэчыць міжнародным стандартам свабоды слова[7]. На 1 кастрычніка 2009 г. у Беларусі было зарэгістравана 557 друкаваных выданняў і навінных агенцый (з іх 402 з’яўляюцца недзяржаўнымі)[8].

Улады наклалі мараторый на прымяненне заганных артыкулаў Закону “Аб СМІ”, якія датычацца онлайн-выданняў. Гэтыя артыкулы закона ўраўноваюць электронныя СМІ з друкаванымі выданнямі, радыё і тэлебачанннем, што дазваляе ўладам абмяжоўваць свабоду Інтэрнэта. Да сённяшняга дня ўрад выконвае

---

[5] АБСЕ падтрымлівае падтрымлівае форумы, прысвечаныя “Масавым СМІ ў перыяд глабальнага эканамічнага крызісу. Фарміраванне грамадзянскіх адносін,” якія адбыліся 6-7 траўня 2009, і семінар па самарэгуляванні ў СМІ - 8-9 верасня 2009.
[6] Міжнародная місія ў Рэспубліку Беларусь, 20-24 верасня, 2009. па больш падрабязную інфармацыю звяртацца - marc.gruber@ifj.org.
[7] Гл.: Справаздача па назіранні за СМІ май- жнівень 2009
[8] Гл.: http://mininform.gov.by/smi.

мараторый, але зменаў у законе не адбылося, і ён па-ранейшаму мае юрыдычную сілу. Закон не адпавядае міжнародным стандартам у галіне свабоды СМІ і ўтрымлівае шэраг рэпрэсіўных палажэнняў, якія могуць быць выкарыстанымі для таго, каб заглушыць крытычныя галасы напярэдадні выбараў ці выказванні па іншых вострых палітычных пытаннях[9]. Нягледзячы на тое, што ў "неафіцыйнай заяве" сказана, што ўрад устрымліўвася ад прымянення абмежаванняў, няма гарантыі, што яны не будуць выкарыстоўвацца ў будучыні.

**Іншыя прававыя аспекты**

Станоўчым крокам было закрыццё справы супраць незалежнага часопіса "ARCHE". Справа была ўзбуджана паводле "Закону аб супрацьдзеянні экстрэмізму" у лютым 2009 г., аднак абвінавачванні былі знятыя ў выніку апеляцыі, задаволенай судом у траўні. Нягледзячы на станоўчае завяршэнне дадзенай справы, урад не прывёў закон, які і раней выкарыстоўваўся супраць іншых прадэмакратычных СМІ, у адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі і практыкай.

Урад не дасягнуў ніякага прагрэсу ў змяненні ці адмене заканадаўства аб паклёпе і іншых артыкулаў Крымінальнага кодэксу, якія выкарыстоўваюцца для запужвання і праследу незалежных журналістаў і СМІ, у прыватнасці Артыкул 367 "Паклёп у дачыненні да Прэзідэнта РБ", Артыкул 368 "Знявага Прэзідэнта РБ", Артыкул 369 "Знявага прадстаўнікоў улады", Артыкул 369-1 "Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь" і Артыкул 193-1, які прадугледжвае крымінальную адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі (гл.ніжэй).

Таксама непакояць новыя абмежаванні ў доступе да інфармацыі. Змены ў Законе "Аб дзяржаўнай службе", зацверджаныя 15 ліпеня 2008 г., абавязваюць усіх дзяржаўных чыноўнікаў атрымліваць дазвол ад сваіх начальнікаў перад тым, як пагадзіцца на ўдзел у інтэрвью. Згодна з прэзідэнцкім дэкрэтам №65 (ад 6 лютага 2009 г.) ва ўсіх дзяржаўных установах і прадпрыемствах толькі прадстаўнікі прэс-службы, падкантрольнай Адміністрацыі Прэзідэнта, маюць права прадстаўляць інфармацыю. Гэта яшчэ больш абмяжоўвае доступ незалежных СМІ да дзяржаўнай інфармацыі.

**Рэгістрацыя выданняў**

Пэўны прагрэс быў зроблены ў працэсе рэгістрацыі новых выданняў. Было адменена патрабаванне атрымліваць спецыяльныя дазволы ад мясцовых уладаў па месцы знаходжання СМІ. На 1 кастрычніка з пачатку 2009 г. было зарэгістравана 97 новых выданняў. Нягледзячы на тое, што 92 выданні з'яўляюцца недзяржаўнымі, большасць з іх – непалітычныя па змесце, арыентаваныя на забаўляльныя і рэкламныя матэрыялы. Толькі некаторыя з іх маюць палітычную і навінную скіраванасць, аднак пры гэтым маюць даволі невялікі тыраж. Першая з ліку нядаўна зарэгістраваных газет – "Узгорак" – мае наклад у 1,000 асобнікаў, якія распаўсюджваюцца ў трох раёнах Магілёўскай вобласці. Але за месяцы, якія прайшлі пасля рэгістрацыі, газета неаднаразова скардзілася на перашкоды з боку "Белсаюздруку", што адмоўна адбілася на яе продажы[10].

За справаздачны перыяд урад адмовіў у рэгістрацыі тром новым дзяржаўным выданнямі: "Салігорск Плюс" (Салігорск), "Новая Газета Бабруйска" (Бабруйск) і "Магілёўскі Час" (Магілёў). Першым двум было адмоўлена на падставе таго, што іх рэдакцыі размяшчаліся па прыватных адрасах. Трэцяй газеце было адмоўлена таму, што галоўны рэдактар газеты не мае вышэйшай адукацыі, нягледзячы на тое, што рэгістрацыйная працэдура не патрабуе ніякай спецыфічнай інфармацыі пра ўзровень адукацыі рэдактароў[11].

[9] "Ускосныя меры ўціску на СМІ могуць быць ужыты падчас прэзідэнцкіх выбараў", БелаПАН, 18 жніўня 2009
[10] Крыніца: выдаўца газеты "Узгорак"
[11] Гл.: http://baj.by/m-p-viewpub-tid-1-pid-7469.html

**Свабода распаўсюджвання інфармацыі**

Дзве незалежныя газеты былі дапушчаны да сістэмы Белсаюздруку, які мае манаполію на распаўсюджванне перыядычных выданняў у Беларусі. Іх можна набыць у кіёсках з сярэдзіны ліпеня. У 2009 г. мясцовыя газеты "Бабруйскі Кур'ер" і "Вольнае Глыбокае" далучыліся да "Нашай Нівы" і "Народнай Волі" у дзяржаўных кіёсках (апошнія былі вернуты ў афіцыйную сістэму распаўсюджвання ў лістападзе 2008 г.). У той жа час, амаль палова з зарэгістраваных у Беларусі незалежных грамадска-палітычных выданняў, 12 з 25, атрымалі адмову ў дыстрыбуцыі ад Белсаюздруку і Белпошты таму, што яны маюць малыя наклады і іх распаўсюджванне будзе стратным[12]. Аднак наклад кожнага з гэтых 12 выданняў значна большы за "Узгорак", а многія друкуюць больш за 5,000 асобнікаў, якімі абмежаваныя, згодна дзяржаўным кантрактам, газеты "Наша Ніва" і "Народная Воля". Газеты "Товарищ", "Інтекс-Пресс" і "Свободные Новости Плюс" маюць наклады больш за 20,000 асобнікаў кожная. Дзяржаўныя манапалісты праігнаравалі рэкамендыцыі Каардынацыйнай Рады па СМІ з заклікам падпісаць кантракты з усімі незалежнымі выданнямі.

Беларускія ўлады працягваюць абмяжоўваць вяшчанне СМІ з-за мяжы. Міністэрства замежных спраў адмовіла ў акрэдытацыі карэспандэнтам Белсату, Радыё Рацыя і Еўрапейскага радыё для Беларусі, якія знаходзяцца на тэрыторыі Польшчы, а таксама журналістам, якія працуюць на іншыя замежныя СМІ. У Беларусі "супрацоўніцтва з замежнымі СМІ без акрэдытацыі" па-ранейшаму застаецца адміністратыўным парушэннем, якое караецца штрафам. Паводле справаздачы Беларускай асацыяцыі журналістаў, за гэтае "парушэнне" як мінімум 14 супрацоўнікаў СМІ атрымалі афіцыйныя папярэджанні ад пракуратуры ці КДБ[13]. Урад працягвае ігнараваць заклікі Еўрапейскага Парламента[14], ПАСЕ і іншых еўрапейскіх інстытутаў да спрашчэння працэдуры акрэдытацыі для карэспандэнтаў мясцовых і замежных СМІ і рэгістрацыі прадстаўніцтва Белсат у Беларусі.

У кастрычніку Міністэрства Інфармацыі Беларусі вымусіла Аўтарадыё (мінскую прыватную FM-станцыю) зняць з эфіра штодзённую навінную і музычную праграму "EuroZOOM". Гэтая праграма ствараецца пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскай Камісіі ў рамках Еўрапейскай Палітыкі Добрасуседства і ў супрацоўніцтве з Еўрапейскім радыё для Беларусі, размешчаным у Варшаве.

З моманту ўвядзення новага Закону "Аб СМІ" урад працягвае ўтрымліваць кантроль над беларускай інфармацыйнай прасторай. Некаторыя станоўчыя змены з'яўляюцца сімвалічнымі і абумоўлены працэсам дыялогу паміж ЕС і Беларуссю. Супярэчлівы Закон "Аб СМІ" застаецца ў сіле і з'яўляецца пагрозай для незалежных СМІ у выпадку, калі спрыяльнае на сённяшні момант міжнароднае асяроддзе зменніцца да горшага.

## СВАБОДА СХОДАЎ

Падчас справаздачнага перыяду сфармаваліся як станоўчыя, так і адмоўныя рысы ў галіне свабоды сходаў. Колькасць адміністратыўных пакаранняў супраць дэмакратычных актывістаў істотна знізілася ў параўнанні з мінулым годам. З кастрычніка 2008 па верасень 2009 мела месца 12 адміністратыўных арыштаў і 82 штрафаў, параўнальна з папярэднім годам 185 арыштаў і 116 штрафаў за такі ж перыяд. Нягледзячы на гэта, падобныя дзеянні па-ранейшаму супрацьстаяць выступленням грамадскасці і перашкаджаюць распаўсюджванню незалежнай прэсы.

**Выбарчае заканадаўства**

---

[12] *Tovarishch*, *Novy Chas*, *Borisovskie Novosti*, *Vitebskij Kurier M*, *Hazeta dla Vas*, *Hazeta, Intex-Press*, *Gazeta Slonimskaya*, *Hanzavicki Chas*, *Niasvizhski Chas*, *SNPlus - Svobodnyje novosti plus* and *ARCHE-Pachatak*

[13] Гл.: Справаздача аб назіранні за СМІ Май-жнівень 2009. 29 жніўня Дзмітрый Кісель атрымаў тэлефоннае папярэджанне аб наступствах, якія яго чакаюць, калі ён не спыніць супрацоўніцтва з Радыё Рацыя, Гл.; "Дзмітрый Кісель атрымаў вуснае папярэджанне" Радыё Рацыя, 24 верасня 2009.

[14] Рэзалюцыя Еўрапейскага парламента аб адносінах ЕС да Беларусі, 14 студзеня 2009

Беларускі ўрад і АБСЕ пагадзіліся перагледзець Выбарчы кодэкс пасля парламенцкіх выбараў 2008 году, якія міжнародныя назіральнікі абвесцілі неадпаведнымі дэмакратычнам стандартам. Працоўная група, мэтай якой было ўнясенне зменаў у кодэкс, правяла дзве дыскусіі у лютым-сакавіку, аднак у іх не ўзялі ўдзел прадстаўнікі грамадскай супольнасці і апазіцыйныя палітычныя партыі. Папярэднія прапановы былі распрацаваныя дзяржаўнай групай экспертаў у маі і перададзены для вывучэння на працягу лета дзяржаўным агенцыям. У кастрычніку Цэнтральны Выбарчы Камітэт абвесціў, што прапанаваныя змены ў Беларускім Выбарчым Кодэксе былі рэкамендаваныя экспертамі з Офіса па Дэмакратычных Інстытуцыях і Правах Чалавека АБСЕ. Але да мясцовых выбараў, прымеркаваных на пачатак 2010, дакумент не быў яшчэ падрыхтаваны і не было ўказана канкрэтнай даты для яго разгледжання Нацыянальнай Асамблеяй падчас сесіі.

**Празмернае ужыванне сілы**

Грамадскія актывісты адзначылі павелічэнне выпадкаў прымянення празмернай сілы супрацоўнікамі міліцыі ў адносінах да адкрытых пасяджэнняў, арганізаваных грамадзянскай супольнасцю і палітычнай апазыцыяй. Як адзначае Беларускі Хельсінкскі камітэт, "большасць дэманстрацый, арганізаваных у 2009 годзе палітычнымі партыямі, няўрадавымі арганізацыямі і групамі грамадзянаў былі гвалтоўна разагнаныя супрацоўнікамі міліцыі".

Нядаўнія прыклады ўключаюць святкаванні з нагоды дзясятых угодак знікнення двух прадстаўнікоў апазіцыі, якія адбыліся 16 верасня і 16 кастрычніка. На кожнае з мерапрыемстваў ў цэнтры Мінску пры Кастрычніцкай плошчы сабралося каля 30-40 чалавек, каб адзначыць дзесяцігоддзе са дня знікнення Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага. У абодвух выпадках мірная дэманстрацыя "Мы памятаем" была неадкладна атакавана міліцыянтамі і ўдзельнікамі, у тым ліку вядомыя прадстаўнікі палітычнай апазіцыі і грамадзянскай супольнасці, быў арыштаваны. У абодвух выпадках ў дачыненні да мірных дэманстрантаў была выкарыстана грубая фізічная сіла. Швецыя, якая ў цяперашні час з'яўляецца старшынёй ЕС, выказала заклапочанасць з нагоды прымянення сілы ў дачыненні да пратэстоўцаў. Швецыя заклікала ўлады "ўстрымацца ад выкарыстання сілы ў дачыненні да мірных дэманстрацый".

**Палітычна матываваныя затрыманні**

Чатыры з 14 маладых пратэстоўцаў, затрыманых падчас дэманстрацый у студзені 2008 года, былі вызваленыя ў адпаведнасці "Законам аб амністыі" у 2009 годзе. Пакаранні Алеся Стральцова і Алеся Чарнышова былі замененыя з абмежавання свабоды на папраўчыя работы, хоць іх адвакаты сцвярджалі, што яны павінныя былі быць уключаныя ў амністыю; а скарга спадара Стральцова была ў верасні адхіленая. Два іншых удзельніка былі прызнаныя вінаватымі ва ўхіленні ад пакарання ў адпаведнасці з артыкулам 415 Крымінальнага кодэкса і адбываюць пакаранне: Арцём Дубскі быў прысуджаны ў ліпені да аднаго году турэмнага зняволення, а Максім Дашук ў чэрвені быў прысуджаны да 15 месяцаў абмежавання свабоды. Тры іншых моладзевых актывісты застаюцца па-за межамі краіны і знаходзяцца ў вышуку.

Пасля шасці месяцаў папярэдняга заключэння, Юры Лявонаў – адзін з трох палітычна актыўных прадпрымальнікаў з Ваўкавыска, арыштаваны ў лютым па падазрэнні ў падпале і змове з мэтай забойства дзяржаўнай асобы – быў вызвалены і ўсе абвінавачванні супраць яго былі зняты[15]. Мікалай Аўтуховіч і Уладзімір Асіпенка застаюцца ў папярэднім турэмным зняволенні. Паводле жнівеньскай заявы Міністэрства ўнутраных спраў, Аўтуховіч і іншыя асобы абвінавачваюцца згодна з артыкулам 359 Крымінальнага кодэкса "тэрарыстычны акт", які прадугледжвае жорсткія санкцыі, нават смяротны прысуд. У красавіку Мікалай Аўтоховіч распачаў шостую з моманту яго затрымання галадоўку, якая доўжылася 91 дзень і стала самай працяглай у Беларусі з 1991 г. Па меркаванні многіх апазіцыйных палітыкаў і абаронцаў правоў чалавека, арышт і ўтрыманне пад вартай прадпрымальнікаў з Ваўкавыска з'яўляецца палітычна матываваным. Пры гэтым улады наўмысна затрымліваюць расследванне. Замежны

[15] Камітэт Абароны Рэпрэсаваных "Салідарнасць". Гл.тут.

эксперт, наняты мінскім офісам АБСЕ для вывучэння справы, наадварот, прыйшоў да высновы, што затрыманне і ўтрыманне прадпрымальнікаў пад вартай з'яўляецца законным. Такая выснова аспрэчваецца прадстаўнікамі дэмакратычнай апазіцыі.

### Перашкоды ў арганізацыі сустрэчаў

Сярод станоўчых момантаў можна адзначыць, што падчас дадзенага перыяду некаторыя буйныя грамадскія арганізацыі і апазіцыйныя палітычныя партыі атрымалі з адносна нязначнымі перашкодамі дазвол на правядзенне мерапрыемстваў. Сярод іх з'езды Беларускай асацыяцыі журналістаў, Беларускай Партыі камуністаў, і Беларускага Народнага Фронту.

Тым не менш, урад працягвае рэгулярна перашкаджаць у арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў грамадзянсай супольнасці і палітычнай апазіцыі. Нядаўнім прыкладам могуць быць "публічныя слуханні", што мелі месца 8 кастрычніка, аб ўздзеянні на навакольнае асяроддзе спрэчнай атамнай электрастанцыі, якая мае быць пабудавана ў раёне Астраўца. Шматлікія прысутныя там асобы ў цывільным спынялі і абшуквалі удзельнікаў нарады. Некаторым палітычным дзеячам, напрыклад, Анатолю Лябедзьку, лідэру Аб'яднанай грамадзянскай партыі, не дазволілі ўвайсці. А расійскі эколаг Андрэй Ажароўскі, які спрабаваў прыняць удзел у слуханнях, быў арыштаваны людзьмі ў цывільным і дастаўлены ў пастарунак Астравецкага раёну.

Шырока распаўсюджана і практыка ўлады адмаўляць у прадстаўленні памяшканняў для правядзення культурных, сацыяльных ці палітычных падзеяў. Напрыклад, Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" мела вялікія праблемы з атрыманнем памяшкання для правядзення свайго Кангрэсу 18-19 ліпеня – яны здолелі атрымаць дазвол на арэнду толькі пасля 19 адмоваў. У кастрычніку партыя Беларуская хрысціянская дэмакратыя атрымала адзінаццатую адмову ў прадстаўленні месца для правядзення свайго ўстаноўчага сходу. Партыя мае намер правесці сход на Кастрычніцкай плошчы Мінска. Шэраг іншых апазіцыйных партый, такіх, як Аб'яднаная грамадзянская партыя і Сацыял-дэмакратычная партыя "Свабода", таксама мелі праблемы з атрыманнем дазволу ўраду на правядзенне партыйных нарад.

## СІТУАЦЫЯ З ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦЮ

Нягледзячы на некаторыя нязначныя паляпшэнні ў сітуацыі з правамі чалавека ў параўнанні з папярэднім шасцімесячным перыядам, абмежаванне асноўных свабод і палітычныя рэпрэсіі ў дачыненні да маладых грамадскіх і палітычных актывістаў, а таксама рэлігійных і этнічных меншасцяў, па-ранейшаму выклікаюць сур'ёзную занепакоенасць. Хаця палітычныя вязні былі вызвалены напярэдадні дыялогу, улады вынаходзяць іншыя формы рэпрэсій, напрыклад, прымусовая вайсковая служба і "абмежаванне волі" (хатні арышт), каб утрымліваць кантроль над апанентамі і іншадумцамі.

Намі вітаецца дэкларацыя аб гатоўнасці беларускіх уладаў уступіць у дыялог з ЕС па пытаннях правоў чалавека, а таксама іх удзел ў першапачатковых кансультацыях па дадзеных пытаннях у Празе ў чэрвені 2009 г., пасля якіх беларускі бок накіраваў запытаную інфармацыю ў МЗС Чэхіі і Генеральны Сэкрэтарыят Рады ЕС. Аднак акрамя гэтага працэсу і за выключэннем вызвалення з турмы амерыканскага адваката Эмануіла Зэльцэра[16], сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі палепшылася нязначна.

### Рэпрэсіі ў дачыненні да моладзевых актывістаў

[16] Спадар Зэльцэр быў арыштаваны пры невысветленых абставінах 12 сакавіка 2008 г, і асуджаны на тры гады турэмнага зняволення за "выкарыстанне падробных афіцыйных дакументаў" і "эканамічны шпіянаж" падчас закрытага судовага слухання. Апеляцыя ў Вярхоўны суд была адхіленая 31 кастрычніка 2008 г, таксама падчас закрытага судовага слухання. Больш падрабязная інфармацыя знаходзіцца тут.

У 2009 г. не было зафіксавана выключэнняў з навучальных устаноў па палітычных матывах. Тым не менш, працягваецца ціск на актыўных студэнтаў з боку КДБ і адміністрацыі. У траўні, Пятру Рузаву, палітычна актыўнаму студэнту Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, быў прад'яўлены загад аб яго адлічэнні, аднак ужо на наступны дзень у выніку шырокай увагі грамадскасці актывіст быў адноўлены ў навучальнай установе[17].

Яшчэ адным сродкам ціску на моладзевых актывістаў стаў палітычна матываваны прызыў у войска. Гэта практыка ў справаздачны перыяд стала больш распаўсюджанай. Урад называе любыя сцвярджэнні аб "палітычнай матываванасці" прызыва "абсалютна неабгрунтаванымі"[18]. Тым не менш, за справаздачны перыяд былі зафіксаваныя новыя выпадкі.

З 2007 г. улады пераследвалі Андрэя Цянюту за тое, што ён з'яўляўся актывістам незарэгістраванай моладзевай арганізацыі Малады Фронт. У лютым 2009 г. ён быў арыштаваны і аштрафаваны за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі пратэста. У траўні ён далучыўся да галадоўкі ў знак салідарнасці з арыштаваным прадпрымальнікам Мікалаем Аўтуховічам. У жніўні Андрэй Цянюта быў гвалтоўна дастаўлены на медычнае даследванне. Нягледзячы на тое, што раней ён быў прызнаны непрыгодным да вайсковай службы па стане здароўя, 25 верасня ён быў вымушаны прыступіць да службы ў войску[19].

Яўген Скрабец, актывіст незарэгістраванай моладзевай групы Малады фронт з Берасця, быў у верасні прымусова прызваны на ваенную службу. Пасля затрымання і змяшчэння ў шпіталь, ён быў агледжаны медыцынскай камісіяй і, нягледзячы на цяжкі стан, прызнаны годным да службы. 21 верасня ён быў накіраваны ў вайсковую частку.

Акрамя таго, 8 кастрычніка ў Нацыянальным Сходзе пачалі разгляд новай версіі закона аб вайсковай службе, які прадугледжвае пакаранне прызыўнікоў, якія ўдзельнічаюць у палітычных мерапрыемствах. Лідэр Беларускага Хельсінкскага камітэта заявіў: "Я не магу узгадаць аніводнай краіны ў Еўропе, дзе караюць палітычна актыўных вайскоўцаў".

**Рэлігійны пераслед**

На працягу гэтага перыяду ўрад працягваў абмяжоўваць правы некаторых рэлігійных груп. На працягу справаздачнага перыяду ўлады надалей прыгняталі Царкву «Новае Жыццё». У 2002 годзе царква набыла ад калгаса кароўнік і ператварыла яго ў малітоўны дом. У 2007 годзе ўрад распачаў судовую справу па канфіскацыі і знішчэнню малітоўнага дому. Вераснёвыя папярэднія слуханні па гэтай справе былі дваццаць сёмай спробай Царквы абараніць свае правы. 7 кастрычніка, Мінскі гарадскі гаспадарчы суд пакінуў у сіле папярэдняе рашэнне аб канфіскацыі будынку. Царква звярнулася да Камітэту па правах чалавека ААН з просьбай аб разглядзе справы. Дазвол на карыстанне зямлёй эвангеліцкая пратэстанцкая царква атрымала ў 2005 годзе, але ў ў кастрычніку ён быў скасаваны ўрадам горада Навапалацка. Гэта ўжо трэці раз за апошнія 15 гадоў, калі рэлігійная суполка была пазбаўленая сваёй зямлі.

27 верасні у праграме Беларускага дзяржаўнага тэлебачання «Панарама" была заатакавана незарэгістраваная партыя Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя, якая была абвінавачана ў тым, што яе ідэалогія несумяшчальная з хрысціянствам.

**Смяротнае пакаранне**

Беларусь надалей застаецца адзінай краінай у Еўропе і на постсавецкай прасторы, дзе смяротнае пакаранне па-ранейшаму выкарыстоўваецца як варыянту прысуду. У 2008 годзе ў Беларусі да смяротнага

[17] "Актывіст узноўлены ва ўніверсітэце пасля шырокага рэзанансу ў СМІ". Радыё Свабода. 29 траўня 2009.
[18] Неафіцыйная заява Беларускага ўрада, верасень 2009.
[19] "Малады актывіст апазіцыі Андрэй Цянюта абскарджвае свой прызыў у войска як нелегальны" БелаПАН, 23 верасня 2009.

пакарання былі прысуджаныя дзве асобы. ЕС і многія міжнародныя арганізацыі ўжо даўно заклікалі Беларусь абвясціць мататорый на смяротнае пакаранне. 23 чэрвеня Рада Еўропы прыняла рэзалюцыю аб тым, што Беларусь будзе мець права аднавіць свой статус спецыяльна запрошанага госця ПАСЕ толькі ў выпадку адмены смяротнага пакарання. Нягледзячы на сцвярджэнні высокапастаўленых афіцыйных асобаў, што Беларусь гатова абвесціць мараторый, суды краіны працягваюць прымяняць смяротнае пакаранне. Пасля прыняцця ўзгаданай Дэкларацыі былі вынесены два смяротныя прысуды - у Брэсцкай вобласці і ў Мінску. Дзявятага кастрычніка, Самюэль Жбогар, старшыня Савета Еўропы Савет міністраў; Луіса Марыя дэ Пуч, старшыня Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы і Генеральны сакратар СЕ Турбьерн Ягланд распаўсюдзілі сумесную заяву, выказаўшы "глыбокую заклапочанасць" з нагоды лёсу Васіля Юзэпчука, 30-гадовага грамадзяніна Беларусі, якога чакае пакаранне. Канчатковы заклік сп. Юзепчука была адхілены Вярхоўным судом 2 кастрычніка. Сп. Юзэпчук паскардзіўся ў Камітэт па правах чалавека ААН на катаванні і адмову ў справядлівым судовым разглядзе, яго выпадак таксама разглядае праваабарончая арганізацыя "Міжнародная амністыя". Восьмага кастрычніка мясцовыя ўлады Баранавічаў забаранілі акцыю пратэсту супраць смяротнага пакарання, прысвечаную Сусветнаму дню супраць смяротнага пакарання. Негледзячы на міжнародныя перамовы па пытаннях паляпшэння крымінальна-выканаўчай сістэмы, Беларусь працягвае уваходзіць у лік краінаў з найбольшай колькасцю зняволеных і па гэтых паказчыках займае другое месца ў Еўропе[20].

## СВАБОДА АСАЦЫЯЦЫЙ

Напачатку дыялогу з ЕС у практыцы рэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў можна было назіраць пэўныя станоўчыя змены. Але пасля шматабяцальнага пачатку працэс рэгістрацыі новых незалежных грамадскіх арганізацый затрымаўся, і застаецца важнай праблемай для прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. Пасля рэгістрацыі руху "За Свабоду" напрыканцы 2008 году сярод незалежных актывістаў панаваў асцярожны аптымізм, што рэгістрацыя іншых грамадскіх арганізацыяў таксама будзе магчымай. Аднак у 2009 годзе практычна аніводнай незалежай групе прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці ці палітычнай партыі не ўдалося атрымаць рэгістрацыю. Падчас шасці месяцаў, якія ахоплівае дадзены даклад, беларускія актывісты былі сведкамі толькі шэрага адмоваў у рэгістрацыі арганізацыям высокага профілю. Агульная колькасць зарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў у параўнанні з папярэднімі гадамі застаецца прыкладна такой жа. Па дадзеных Міністэрства юстыцыі у перыяд са студзеня па чэрвень 2009 г., міністэрствам зарэгістравана толькі 47 новых грамадскіх аб'яднанняў, сярод якіх уплывовых арганізацыяў не было. Нягледзячы на размовы аб "лібералізацыі", колькасць зноў зарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў у 2009 годзе будзе самай нізкай за апошнія тры гады.

### Адмовы ў рэгістрацыі

За 2009 год больш за дзесяць буйных грамадскіх арганізацыяў атрымалі адмовы ў рэгістрацыі. Сярод нацыянальных арганізацыяў, якім было адмоўлена ў рэгістрацыі Міністэрствам юстыцыі на працягу справаздачнага перыяду, былі Асамблея дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў, Беларуская хрысціянская дэмакратычная партыя, Партыя свабоды і прагрэсу (чацвёртая спроба рэгістрацыі з 2003 года), Беларуская Партыя Працоўных, "Моладзевы Хрысціянска-сацыяльны саюз" і "Маладыя сацыял-дэмакраты". Сітуацыя з мясцовымі арганізацыямі аказалася не лепш –адмоўлена ў рэгістрацыі было моладзевай групе"МоДэС "(Магілёўская), Культурнай асацыяцыі "Спадчына "(Гродна) і праваабарончай суполцы "Берасцейская Вясна "(Брэст, трэцяя адмова). З 2002 года на Беларусі не было зарэгістравана аніводнай палітычнай партыі.

Урад зноў адмовіў у рэгістрацыі значнай арганізацыі "Нашая Вясна". "Нашая Вясна" з'яўляецца правапераемніцай арганізацыі "Вясна ", адной з вядучых праваабарончых арганізацый Беларусі, якая была ліквідаваная ўладамі ў 2003 годзе. У красавіку 2009 года, лідэр Вясны, Алесь Бяляцкі, атрымаў адмову на зварот з просьбай прадставіць інфармацыю аб мерах, прынятых Міністэрствам замежных

[20]"Беларусь уваходзіць у лік краінаў з найбольшай колькасцю зняволеных, кажуць эксперты," БелаПАН, 10 верасня 2009.

справаў па ажыццяўленню рашэнняў камісіі ААН па правах чалавека ў дачыненні да ліквідацыі ПЦ "Вясна". У 2007 годзе Камітэт ААН па правах чалавека прыйшоў да высновы, што роспуск НВА парушае артыкул 22, пункт 1, Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. Было таксама ўстаноўлена, што, згодна з артыкулам 2, пунктам 3 (а), заяўнікі маюць права на пакрыццё ўчыненай ім шкоды, у тым ліку паўторную рэгістрацыю "Вясны" і кампенсацыі[21]. Адказ за подпісам Віцэ-міністра тлумачыў, што ўрад разглядае пастановы Камітэту ААН па правах чалавека толькі як рэкамендацыі. "Міжнародная амністыя" лічыць, што працяглая адмова ПЦ " Вясна" у рэгістрацыі з'яўляецца спробай з боку дзяржавы пазбаўлення магчымасці супрацоўнікаў "Вясны" ад нармальнага ажыццяўляння сваёй законнай праваабарончай працы.[22]

Большасць падстаў для адмовы ў рэгістрацыі працягваюць надалей з'яўляецца трывіяльнымі, ілжывымі, не прадугледжанымі законам і палітычна матываванымі. Напрыклад, Гродзенскаму рэгіянальнаму аддзяленню партыі БНФ і НДА "БНФ Адраджэньне" было адмоўлена ў рэгістрацыі на той падставе, што іх заявы былі надрукаваныя неналежным шрыфтам, хоць ніякага праўнага рэгулявання гэтага пытання не існуе. У жніўні 2009 года у ходзе разгляду дакументаў паданых на рэгістрацыю Беларускай партыяй працоўных Міністэрства юстыцыі незаконна запатрабавала, каб члены партыі прадставілі дакументы, не прадугледжаныя законам.

За справаздачны перыяд кожная апеляцыя на адмову ў рэгістрацыі грамадскага аб'яднання была адхіленая судамі. Суды таксама падтрымалі рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі прадстаўніцтвам прафсаюзу радыёэлектроннай прамысловасці работнікаў ў Гомелі, Віцебску і Магілёве. Скаргі на адмову ў рэгістрацыі "Беларускай хрысціянскай дэмакратыі" і "Нашай Вясне"ў Вярхоўны суд таксама не былі задаволеныя[23].

**Папраўкі ў заканадаўства**

Недасканалае заканадаўства Беларусі дазваляе дзяржаўным органам адмаўляць ў рэгістрацыі без якіх-небудзь істотных падстаў. У 2009 ўлады выступілі з заявамі аб магчымасці спрашчэння працэсу рэгістрацыі няўрадавых арганізацый і палітычных партый шляхам унясення зменаў у законы "Аб палітычных партыях" і "Аб грамадскіх асацыяцыях. "Змены былі прынятыя ў першым чытанні і ў цяперашні час падрыхтаваны для разгляду ў другім чытанні ў парламенце, запланаваным на восень гэтага года. Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі сцвярджаюць, што працэс рэгістрацыі будзе спрошчаны, у прыватнасці, тым, што "няпоўныя наборы" прадстаўленых дакументаў не будуць больш служыць законнай падставай для адмовы.

Аднак прапанаваныя папраўкі, нібыта накіраваныя на палягчэнне рэгістрацыі, на самой справе спрошчваюць працэс адмовы. Паводле незалежнага аналізу, прапанаваныя змяненні накіраваныя на замену цяперашніх неабгрунтаваных падстаў для адмовы больш надзейнай прававой асновай для адмовы. Згодна са зменамі ў законе, падставай для адмовы могуць быць супярэчнасці з заканадаўчымі патрабаваннямі Статута, але не толькі з пункту гледжання мэт, задач, метадаў і абласцей дзейнасці, але і ўсіх іншых палажэнняў Статута. Акрамя таго, з'яўляецца новая падстава для адмовы ў рэгістрацыі – "прадастаўленне грамадскімі арганізацыямі, прафсаюзамі дакументаў і / або інфармацыі, якая не адпавядае патрабаванням заканадаўства, у тым ліку ілжывых або падробных дакументаў". Грамадзянскай супольнасці падаецца, што гэтыя нормы не накіраваны на спрашчэнне рэгістрацыі, але, наадварот, на спрашчэнне адмовы ў рэгістрацыі. Адзіным станоўчым змяненнем з'яўляецца аўтаматычная рэгістрацыя НДА ў падатковых органах (раней гэта трэба было рабіць самастойна). Гэта змена ў аніякай меры не ўтрымлівае якіх-небудзь істотных паляпшэнняў для незалежных арганізацый.

---

21 Паведамленне №. 1296/2004 на падставе індывідуальнай скаргі
22 Гл. там жа
23 Праваабарончы цэнтр Вясна, 12 жніўня 2009, Беларускі Хельсінскі Камітэт, 22 ліпеня 2009

З-за цяжкасцяў, звязаных з рэгістрацыяй у якасці грамадскага аб'яднання, шэраг незалежных арганізацый былі вымушаны спрабаваць зарэгістравацца ў якасці "установы". Напрыклад, моладзевая арганізацыя "Правы альянс", якой было адмоўлена ў рэгістрацыі ў якасці грамадскай арганізацыі ў 2004 годзе, удалося зарэгістравацца ў якасці ўстановы ў 2009 годзе. У гэтым годзе беларускі ўрад спрасціў працэс рэгістрацыі ў якасці ўстановы. Але улічваючы той факт, што юрыдычна установы не з'яўляюцца члецкімі арганізацымі, гэта не павялічвае свабоду асацыяцый. Што немалаважна, ўстановы не валодаюць многімі правамі, прадастаўленымі зарэгістраваным грамадскім аб'яднанням, такімі як права прадстаўляць інтарэсы грамадзяніна ў судзе, дэлегаваць сваіх членаў для назірання за выбарамі і працаваць у выбарчых камісіях, і падаць заявы на дзяржаўную фінансавую падтрымку. Было выказана меркаванне, што ўрад аблегчыў рэгістрацыйны працэс для установаў, і зарэгістраваў некаторыя арганізацыі ў гэтай катэгорыі, каб прадэманстраваць больш лібэральны падыход, але ў той жа час забяспечыць тое, каб гэтыя установы прадстаўлялі меншую пагрозу, чым яны б прадстаўлялі зарэгістраванымі ў якасці грамадскіх аб'яднанняў.

**Артыкул 193-1**

Грамадзянская супольнасць па-ранейшаму з'яўляецца мішэнню для артыкула 193-1 Крымінальнага кодэксу, які прадугледжвае крымінальную адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, і злоўжывання  ім з боку ураду. З 2006 года па гэтым артыкуле былі асуджаныя 17 чалавек. За разглядаемы перыяд выкарыстанне артыкула застаецца адвольным і выбарачным. Артыкул па-ранейшаму выкарыстоўваецца для запалохвання актывістаў грамадзянскай супольнасці, асабліва моладзі, каб устрымаць іх ад удзелу ў несанкцыянаваных мерапрыемствах. У сакавіку 2009 напярэдадні кангрэсу непрызнанага Саюза палякаў у Беларусі будучых удзельнікаў афіцыйна папярэджвалі аб магчымасці судовага пераследу па артыкуле 193-1, калі яны прымуць удзел у кангрэсе[24]. У верасні «Міжнародная Амністыя» заклікала беларускія ўлады неадкладна адмяніць артыкул 193-1, "каб людзі маглі рэалізаваць сваё права на свабоду асацыяцыяў,  вольных ад пераследаў і запалохвання"[25]. Міжнародная Хельсінская Федэрацыя па абароне правоў чалавека абвясціла, што гэты артыкул «парушае Канстытуцую Рэспублікі Беларусь, якая гарантуе свабоду асацыяцый, а таксама Артыкул 22 Міжнароднага Пагаднення па Грамадзянскіх і Палітычных правах Арганізацыі па Бяспецы і Супрацоўніцтву ў Еўропе». У кастрычніку 2009 года тры прадстаўнікі Парламента Швецыі, краіны-старшыні ЕС на дадзены момант, папярэдзілі беларускі ўрад аб неабходнасці скасаваць Артыкул 193-1.

У маі за дзейнасьць ад імя незарэгістраванй арганізацыі "Расейскі нацыянальны саюз" быў асуджаны Андрэй Несціяровіч. Прысуд ў дачыненні да яго не быў выкананы ў сувязі з амністыяй[26]. У ліпені гомельская абласная пракуратура адмовіла прыпыніць крымінальную справу ў дачыненні да моладзевага актывіста Кірыла Атаманчыка, распачатую ў 2007 годзе за дзейнасць у незарэгістраванай арганізацыі Малады фронт. У жніўні брэсцкі актывіст Міхаіл Іллін атрымаў пракурорскае папярэджанне, што супраць яго будзе распачатая крымінальная справа, калі ён не спыніць дзейнасць у шэрагах Маладога фронту[27].

Артыкул 193-1 быў упершыню выкарыстаны як падстава для ўзбуджэння крымінальнай справы супраць асобаў, якія выступаюць ад імя незарэгістраваных рэлігійных арганізацый. У ліпені 25-гадовы Яўген Волкаў быў авінавачаны ў дзейнасьці ад імя "Руху яднання" (Царква Муна), які забаронены ў Беларусі. Пазней справа была прыпынена. Раней гэты арыткул выкарыстоўваўся выключна ў дачыненні да сябраў незарэгістраваных палітычных аб'яднанняў[28].

**Юрыдычныя адрасы**

---

24 "Ізноў артыкул 193-1", *Нава Ніва*, 19 ліпеня 2009.
25 "Міжнародная амністыя" папярэджвае Лукашэнка, каб каб праваабаронцы цэнтр "Вясна" атрымаў рэгістрацыю" БелаПАН, 22 верасня 2009.
26 "Экстрэміст трапіў пад амністыю ў сувязі з 65 угодкамі перамогі ў Другой Сусветнай Вайне" Кааліцыя Супраць Нянавісці, 9 ліпеня 2009.
27 "Актывісту Маладога Фронту шыюць справу?" Радыё Свабода, 12 жніўня 2009.
28 "Малады чалавек абвінавачваецца ў дзейнасці ад імя Руху Яднання" БелаПАН, 2 ліпеня 2009.

Патрабаванне мецъ юрыдычныя адрасы для няўрадавых арганізацыяў у нежылым фондзе з'яўляецца вялікай праблемай як для новапаўсталых, так існуючых аб'яднанняў. Напрыклад, барысаўскае аддзяленьне НДА "Дзеці ў бядзе" было змушана спыніць сваю дзейнасць у красавіку з-за немагчымасці далей аплочваць высокую арэндную плату. Арганізацыя некалькі разў безпасьпяхова звярталася да мясцовых уладаў з просьбай знізіць арэндную плату.

З красавіка працягваецца барацьба БНФ, старэйшай апазіцыйнай палітычнай партыі ў Беларусі, за аднаўленне арэнды на памяшканне ў Мінску, дзе размяшчаецца галоўная сядзіба арганізацыі. На падставе спазнення з арэнднай платай, уладальнік будынку адмовіўся працягваць доўгатэрміновы кантракт з БНФ. Сядзіба арэндуецца на падставе кароткатэрміновых, месячных дамоваў і можа быць спынена ў кожны момант. У сваю чаргу, гэта азначае неадкладную ліквідацыю партыі.

Нягледзячы на снежаньскія заявы 2008 года з боку ўраду пра спыненне пастаянных праверак дзейнасці НДА, грамадзкія арганізацыі ў Беларусі працягваюць сутыкацца з шматлікімі праверкамі з боку розных кантрольных і праваахоўных арганізацый. Напрыклад, у маі 2009-га году НДА "Экадом", якая вядзе грамадзкую кампанію супраць урадавых планаў пабудовы атамной электрастанцыі ў Беларусі, сутыкнулася з хваляй праверак з боку падатковых органаў і атрымала штраф у памеры 14 мільёнаў БРБ (каля 3,000 эўра). Банкаўскі рахунак арганізацыі быў арыштаваны. На думку кіраўніцтва арганізацыі, яны сталі ахвярай палітычнага пераследу. "

## Дыскрымінацыя Незалежных Прафсаюзаў

Пасьля некаторых саступак пад ціскам МАП беларускія ўлады ізноў пачалі пераслед незалежных прафсаюзаў. 28-га жніўня Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) надрукаваў сваю экспертызу па пытанні выканання Беларуссю рэкамэндацый МАП. У гэтым дакуменце незалежныя прафсаюзы абвінавачваюць улады ў парушэнні асноўных правоў: свабода рэгістрацыі і непераслед. Гэта сведчыць пра зварот да папярэдняй практыкі дыскрымінацыі свабоднага прафсаюзнага руху[29]. У верасні БКДП абвінаваціў улады ў аднаўленні ціску на сяброў неазлежных прафсаюзаў[30]. Незалежным прафсаюзам з "Гроднаазот" і " Нафтану" было адмоўлена ў падпісаньні калектыўнага пагаднення з боку кіраўніцтва прадпрыемствам. Супрацоўнікі мазырскага нафтаперааапрацоўчага заводу і Брэсцкага дзяржаўнага універсытэта сутыкнуліся з ціскам з боку адміністрацыі, якая змушала іх адмовіцца ад сяброўства ў незалежных прафсаюзах. У адказ БКДП збіраецца прыпыніць сваё членства ў Нацыянальнай радзе па працоўных і сацыяльных пытаннях і рыхтуе адкліканне свайго прадстаўніка з дарадчай рады па пытаннях працоўнага і сацыяльнага заканадаўства.

[29] Камэнтары БКДП па ажыцця ўленні Канвенцыяў МАП 87, 98 і 122 у Беларусі, прадстаўлены ў МАП у Жэневе, 28 жніўня 2009.
[30] "Беларускі Кангрэс Дэмакратычных Прафсаюзаў абвінавачвае Беларускі ўрад у працягванні рэпрэсій у дачыненні да супраць незалежных прафсаюзаў" БелаПАН, 3 верасня 2009.